**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорнай студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Эврика» ДУА «Жлобінскі гарадскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка» Гомельскай вобласці**

Студыя выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Эврика» арганізавана на базе Жлобінскага гарадскога цэнтра творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка» ў 1997 годзе. Галоўная мэта студыі – не проста навучыць дзіця прыёмам рамяства, але абудзіць фантазію і ўяўленне, якія дапамогуць юнаму таленту развіцца ў яркую, творчую асобу.

У цэнтры творчасці займаюцца 585 навучэнцаў, з якімі працуюць педагогі 14 аб'яднанняў па інтарэсах, якія ўваходзяць у склад студыі: «Акварэлька», «Вясёлкавыя фарбы», «ПлаФо», «Саламандра», «Чараўнікі», «Юны мастак». Іх кіраўнікі маюць багаты творчы і педагагічны вопыт, выхаванцы пастаянна ўдзельнічаюць у міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і раённых конкурсах і выстаўках, атрымліваюць высокія ўзнагароды.

Дзеці наведваюць заняткі з дзіцячага садка і працягваюць займацца пасля заканчэння школы. Навучэнцы студыі вучацца думаць, марыць і, з дапамогай педагогаў, увасабляць свае мастацкія ідэі і фантазіі ў жыццё

Важны складнік жыцця студыі – актыўная конкурсная дзейнасць. Тэматычныя конкурсы садзейнічаюць фарміраванню шырокага кругагляду і эрудыцыі навучэнцаў, якія набываюць навык знаходжання адказаў на пастаўленыя пытанні з дапамогай мастацкіх сродкаў.

Удзельнікі развіваюць інтэлектуальныя здольнасці, атрымліваюць шмат інфармацыі, карыснай для выбару будучай прафесіі.

Праводзіцца работа па прафарыентацыі навучэнцаў. Педагогі выяўляюць, дапамагаюць прафесійна зарыентавацца і падрыхтавацца да паступлення адораным навучэнцам. За апошнія гады шэраг выпускнікоў студыі паступілі на навучанне па профілі.